# КАРТА МАРШРУТУ

**Назва маршруту:** «СВІСЛАЦКІ КРАЙ»
**Вобласць:** Гродзенская
**Назва каманды:** «Юныя краязнаўцы»
**Населены пункт:** аграгарадок Корнадзь
Піянерская дружына імя Юрыя Смірнова, дзяржаўная ўстанова адукацыі "Вучэбна-педагагічны комплекс Корнадзькі  дзіцячы сад-базавая школа"
**Педагог-кіраўнік:** Груша Наталья Юр'еўна

**QR - КОД:**

| № | Назва і апісанне аб'екта (яго ўнікальнасць, цікавыя факты, гісторыка-культурная каштоўнасць) | Фота аб'екта | Адрас або размяшчэнне |
|---|---|---|---|
| 1. | **Пачаць аўтобусную экскурсію мы прапануем ў горадзе Свіслач Гродзенскай вобласці.**<br>Музей Хлеба існуе з 2002 года і прадстаўлены наступнымі экспазіцыямі: “Першы хлеб”, “Гісторыя земляробства”, “Працэс вытворчасці хлеба”, “Гаспадары зямлі свіслацкай”, “Харчовая каштоўнасць хлеба”.<br>У час экскурсіі “Беражыце хлеба кожную крупіцу”можна даведацца пра тое, як жылі нашы продкі, як нялёгка было вырошчваць хлеб.<br>Ёсць магчымасць не толькі пазнаёміцца з бытам сялян, але і пакаштаваць сапраўдны жытні свіслацкі хлеб, які больш ужо не сустрэнеш нідзе: чорны, белы, здобны. Можна выбраць любы: круглы або фармавы, жытні або пшанічны, з кменам, макам, арэхамі, разынкамі. Мноства самых розных хлебабулачных вырабаў выпякаецца на | <br><br> | **г.Свіслач Гродзенская вобласць**<br><br>**г.Свіслач, вул.Чырвонаармейская 21** |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | прадпрыемствах хлебапякарнай прамысловасці Свіслаччыны.<br>Калі час будзе дазваляць, можна наведаць Алею помнікаў, стары будынак гімназіі, дзе калісьці вучыўся Кастусь Каліноўскі і , зразумела, прысядзібны парк пры былой сядзібе Тышкевічаў. | | |
| **2.** | **Наступным экскурсійным аб'ектам можа стаць музей Ільну, які створаны ў 2007 г.на базе ДУА "Вучэбна-педагагічнага комплекс Грынкаўскі дзіцячы сад – базавая школа".**<br>Цяпер налічвае 208 экспанатаў. Сярод іх ёсць сапраўдны ткацкі станок, які займае ў музеі цэнтральнае месца.<br>Наведвальнікі могуць назіраць увесь працэс апрацоўкі льну: ад вырошчвання да вытворчасці льняной тканіны паводле 8 экспазіцый: "Лён – наш гонар і багацце", "Ільнаводства ў Беларусі", "Лён на Свіслаччыне", "Нашы льнаводы", "Слонімскі льнокамбінат", "Аршанскі льнокамбінат", "Тэхналогіі апрацоўкі льну ў мінулым", "Грынкоўскія майстрыхі". |  | **аг. Грынкі, вул. Лобача,5** |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Для экскурсантаў ёсць магчымасць стаць удзельнікамі экскурсій “Ад душы працуеш – Радзіму мацуеш”, “Лён у жыцці беларусаў”, “Традыцыйныя спосабы апрацоўкі льну” і др. | | |
| **3.** | **Далей экскурсія працягваецца ў музей Лесу Дабравольскага дзіцячага сада — сярэдняй школы**.<br>Установа адукацыі размешчана на тэрыторыі Нацыянальнага парку “Белавежская пушча”, што і вызначыла накірунак работы музея, які дзейнічае з 1989 года. У цяперашні момант у музеі больш за 400 экспанатаў, якія прадстаўлены ў дзявяці частках экспазіцыі: мінералы і горныя пароды, птушкі Белавежскай пушчы, дрэвы Белавежскай пушчы, жывёлы нашага лесу, жыхары лесу, лугу, поля, лекавыя расліны, пушча вачыма дзяцей, дарункі лесу, міфалогія лесу. Арганізоўваюцца часовыя тэматычныя выставы “Народныя майстры”, “Прагулка ў лесе”.<br>Менавіта тут можна адпачыць душой, паспрабаваць карысны травяны чай, даведацца многа цікавага пра народныя |  | **аг. Дабраволя, вул. Міра, 2** |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | рэцэпты, замовы , абярэгі і атрымаць духмяны збор у падарунак.<br>Ва ўстанове ёсць яшчэ і міні-музей “Страчаная спадчына Свіслацкага краю” прысвечана тым паселішчам і храмам Свіслаччыны, якіх няма на сучаснай карце Свіслацкага раёна, але яны заўжды будуць у памяці яе жыхароў. На пляцоўцы, якая ўяўляе сабой геаграфічную карту Свіслацкага раёна, размешчаны аб’екты-прысвячэнні памяці зніклым храмам, якія раней былі размешчаны на тэрыторыях сямі сельскіх Саветаў Свіслацкага раёна.<br>Калі дазваляе час, раім наведаць у гэтай мясцовасці жывёлагадоўчую ферму, для якой характэрна робатызіраваная сістэма даення Lely Astronaut, якая да мінімуму скараціла долю чалавечай працы ў вытворчасці малака.<br>Ёсць магчымасць пазнаёміцца з сакрэтамі работы з дрэвам, атрымаць майстар-клас у Святаслава Лешчука, народнага майстра мясцовасці. | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **4.** | Вас зацікавіла Свіслаччына і ўзнікла жаданне прыныніцца тут на некалькі дзён, раім заказаць нумар і пакінуць свае рэчы ў **гасцінічным комплексе “Жаркаўшчына”**, які размешчаны недалёка ля вёскі Дабраволя , дзе турыстам акрамя пражывання і харчавання прапануюцца такія віды паслуг, як лазня, пракат веласіпедаў, лыжаў і г.д..<br>А апетытная страва “Калдуны” па своеасаблівым рэцэпце нікога не пакіне раўнадушным. |  | **в.Жаркаўшчына** |
| **5.** | Невялікая драўляная хата з пушчанскага дрэва была пабудавана ў 1932 годзе жыхаром вёскі Ігнатам Гайдукевічам. У так называемай чыстай палавіне і кухні знаходзіцца больш за 250 матэрыяльных сведкаў, якія ілюструюць быт каранного насельніцтва.<br>Па старыннай тэхналогіі адрамантавана руская печка, якая служыла гаспадарам месцам абагрэву і прыгатавання ежы, і сушкай для грыбоў і ягад.<br>У калекцыі музея ёсць сапраўдныя дакументы, якія сведчаць пра нялёгкае жыццё мясцовых жыхароў. Вельмі |  | **в. Рудня** |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | цікавая калекцыя грашовых знакаў, якія цыркуліравалі на тэрыторыі Белавежскай пушчы многія гады і эпохі. Але асаблівая гордасць музея – калекцыя копій гравюр караннога пушчанца, вядомага дарэвалюцыйнага аўтара і ілюстратара выданняў пра прыроду і быт Белавежскай пушчы Антона Камінскага, а таксама партрэты вядомых людзей, якія пабывалі ў Рудні. Сярод іх партрэты генералаў расійскай і французскай армій, якія праводзілі праз Рудню войскі восенню 1812 года. | | |
| **6.** | Школьны музей у маёй роднай вёсцы Корнадзь авеяны добрай славай. У выніку стараннай працы навучэнцаў, работнікаў школы і бацькоў музей атрымаў цікавую і змястоўную экспазіцыю. Яго фонды налічваюць больш за 500 экспанатаў, якія адлюстроўваюць розныя бакі жыцця народа пачатку XX стагоддзя. Усе 6 экспазіцый: “Ручнік – дарога чысціні”, “Вышыўка і ткацтва”, “Работы настаўнікаў і вучняў”, “Народны побыт”, “Беларуская хатка”, “Сучасны ручнік” заснаваны на наступных |  | **аг.Корнадзь,30** |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | прынцыпах – ідэйнасць, навуковасць, універсальнасць.<br>Тут сканцэнтраваны багаты этнаграфічны матэрыял: традыцыйныя сельскагаспадарчыя і рамесніцкія прылады працы, драўляны і керамічны посуд, начынне з лазы, вырабы хатняга ткацтва. Аднак асаблівую цікавасць уяўляюць ручнікі пачатку 20 стагоддзя. Ім у музеі адведзена важнае месца, іх ролі на розных этапах чалавечага жыцця. Кожны аздоблены непаўторнай, каларытнай, уласцівай нашай мясцовасці вышыўкай. Разнастайнасць проста здзіўляе: вылучаюцца сваёй белізной выціральнікі, прыгажосцю аздаблення - набожнікі і вясельныя, сціпласцю – пахавальныя, сімвалічнасцю – абярэгі. Экскурсанты могуць стаць не толькі назіральнікамі, але і ўдзельнікамі квест-экскурсіі “Ручнік – дарога чысціні”, экскурсій “Ручнік у чамадане”, “Незвычайнае побач, ці сем цудаў Панямоння”, “Вёсачка стаіць на ўзлесачку” і інш..<br>Ці ведаеце Вы, як нашы продкі абараняліся ад хвароб ці бяды, |  | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | няшчасця, ліха? Як прыцягвалі поспех і здароўе? Ім дапамагалі ў гэтым абярэгі.<br>Пад час майстар-класу "Лялькі з бабулінага куфэрка" ўдзельнікі змогуць не толькі пазнаёміцца з некаторымі абрадавымі лялькамі, але і зрабіць сваю, адметную і непаўторную, якая стане абярэгам на ўсё жыццё.<br>"Ух, зусім распаясаўся..." – спадзяемся вам ніколі не даводзілася чуць такія словы ў свой адрас. Адкуль пайшло такое выказванне, чаму поясу нашыя продкі надавалі такое значэнне, надзялялі абярэгавай сілай, выкарыстоўвалі ў абрадах… Пра гэты такі звыклы і ў той жа час цікавы элемент адзення юныя наведвальнікі могуць даведацца, прыйшоўшы на занятак "Сакрэты ткацкага рамяства". Акрамя таго, ёсць унікальная магчымасць на ўласным вопыце пазнаёмяцца са старажытнай тэхнікай ткацтва на бердзечку, дошчачках, на ніту: выткуць паясок, які забярэш сабе на памяць.<br>Улічваючы той факт, што на тэрыторыі Свіслацкага раёна дзейнічае бязвізавы | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | рэжым, пазнаёміцца з унікальнымі музеямі даступна жыхарам блізкага і далёкага замежжа, якія, карыстаючыся магчымасцю наведаць наш край, змогуць увачавідкі пераканацца ў тым, як мы шануем памяць аб тым, што было калісьці па розных прычынах страчана, а цяпер захоўваецца нашчадкамі.<br>Ёсць магчымасць і больш дасканала пазнаёміцца з турыстычнымі аб’ектамі Свіслаччыны праз электронныя рэсурсы “Чым хата багата”, “Да суседзяў”, “Віртуальны музей Ручніка”. | | |